# Пад нашым небам

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага літаратурнага аб'яднання
"БЕЛАВЕЖА"

---

Серыя заснавана ў 1990 г.

**Кніга пяцьдзесят шостая**

Рэдактар
*Ян Чыквін*

Карэктар
*Вера Іванюк*

На вокладцы
*Валеры Шкарубо, Дзічка (фрагмент)*

Zrealizowano ze środków finansowych Ministra
Spraw Wewnętrznych i Administracji

© Copyright by Jerzy Bajena, 2007

ISBN 978-83-60534-49-6
**Nr 56**

PRYMAT
Mariusz Śliwowski
Białystok, ul. Zwycięstwa 26C lok. 7
tel. 869 14 87, 0602 766 304
www.prymat.stnet.pl, e-mail: prymat@stnet.pl

Юрый Баена

# Пад нашым небам

KAMUNIKAT.org

Беласток 2007

KAMUNIKAT.org

* * *

На гэтай зямлі,
пад гэтым небам
пішу свой верш.

У вокны стукаюць
гарачыя думкі,
неспакойныя словы,
няздзейсненыя мары.

У бяссонную ноч
спатыкаюся
аб карэнні болю.

Хораша мне маніцца сказаць
пра вернасць
непагаснаму роднаму.

Паэма пра любоў
да чатырох сцен дома
таксама яшчэ ненапісана.

Таму на тваю
дапамогу разлічваю –
с э р ц а!

## СЭРЦА

Усе дарогі вядуць да сэрца:
дробныя жылкі,
шырокія вены.

Яны — быццам шасэ,
аўтастрады,
палявыя сцежкі.

Сярод гоману вуліцы
ўважліва слухаю
голас сэрца.

Нясу ў ім камяні дзён,
тугу,
захапленні, любоў,
іскрынкі надзеі.

Акрамя агню і вады,
зямлі і паветра,
хвароб і голаду,
нішто не пагражае.

Боль сэрца...
Ён ад душы,
ад пыхлівасці слоў...
Сэрца, як дом.
Самая высакародная ў ім –
матчына кроў.

* * *

Пад тваю абарону іду,
слова першае,
беларускае, пісанае ў кнігах
і няпісанае.

Гонар ты мой,
кветка лілея,
скарбніца вякоў
і надзея.

Слова роднае,
неўміручае,
ты, як сцяг
у снягах.

Вакол завея.

KAMUNIKAT.org

## НА ГЭТАЙ ЗЯМЛІ

На гэтай зямлі
праклалі шляхі
дзяды і прадзеды.

На гэтай зямлі
пакідаем сляды
сваёй прысутнасці.

На гэтай зямлі
першыя крокі ставяць
нованароджаныя.

Святое імя
гэтай зямлі,
золатам і срэбрам пісанае –

Яно ў сэрцах нашых!

KAMUNIKAT.org

## ІДЗЁМ ПА ШЧАСЦЕ

Даўным-даўно, спакон веку
ідзём па шчасце.

Дарогамі і бездарожжам
ідзём ажывіць мары.

Упаўшы, падымаемся,
каб не згаснуць.

Схіленыя над калыскай,
будучыню чакаем.

Наш сцяг – надзея,
што ў памяці трывае.

Яна на белым палатне
з бяссмерця вышыта...

kamunikat.org

* * *

Мама мілая,
век цэлы нябачная,
непрысутная,
блізкая нябёсам,
у час зацьмення
яшчэ раз
пакажы мне сонца.

Чулліва адзавіся шэптам,
веснавой песняй,
шолахам траў і лісця.

Яшчэ раз
святочным ранкам
павядзі ў блакітную царкву,
у Падбелле –

Як у Галілею.



kamunikat.org

* * *

**жонцы і дзецям**

Мілая мая, дзеткі мае,
давайце шчыльна
прытулімся да сябе,
каб пагрэцца
цяплом сэрцаў.

І каб пайсці
ўслед за першай
найдаражэйшай,
яснай,
нашай непагаснай
зоркай шчасця...

KAMUNIKAT.org

* * *

**жонцы**

Неба і зямля.
Агонь і вада.
Дзень і ноч.
Ява і сон.
Сцяна і акно.
Дабро і зло.
Рай і пекла.
Так і Не.
Ціша і спеў.
Шчасце і боль.
Хлеб і соль.
Лёс і выбар...

Гарызонт – мяжа,
лінія адна.

У цэнтры Ты,
а побач – я...

KAMUNIKAT.org

# РОДНЫМ

Сцеражыце ўспаміны – яны ваша памяць.
Не бойцеся ветру, ідзіце ў замець.

Спяшайце на абарону матчынай мовы,
Якая прылашчыць у вечар зімовы.

З вокнаў дзяцінства гляньце на дарогу:
Мо хтосьці за вамі падыходзіць к парогу?

Будзьце сябрамі, будуйце згоду,
Каб жыццё стала годным.

У найвялікшай пашане
Сустракайце родных!

KAMUNIKAT.org

## У ЦІШЫ СВЕТУ

У цішы,
у глыбокай цішы свету
святло дрыготкае нясу,
агонь душы паэта.

Дзяцінства сцежкамі іду,
пакінутай дарогай.
Пялёсткі ружы рассыпаю
ля кожнага парога.

У траве бяспамяцтва
праціраю вочы.
Ахрыплым голасам вякоў
крычу ў самоце:

Роднае, устань,
уваскрэсні.
Вярніся ў край
з песнямі,
з прадвеснем!

kamunikat.org

* * *

Паміж апушчанымі
або адвернутымі тварамі
шукаю
святла праўды.
Безыменных пытаю
пра іх імёны –
чалавечыя.
Упаўшых
або ішоўшых на каленях –
падымаю.

Вучуся цішы,
болю ў самоце,
крыку каменя...

Поўнач мінула, я не сплю.
Шукаю слоў,
каб назваць
неназванае.
У пустыні сэрцаў
не гояцца
раны.

* * *

Неспакойным дням
пісьмы шлю
акамянелым сэрцам.

Нямы крык душы
праз агонь нясу
і завеяў цемру.

Адзінокі іду,
бо мне трэба
сустрэцца з братамі.

У адчаі прашу:
Неба,
нахіліся над намі!

KAMUNIKAT.org

## НАДЗЕЯ

Прыходзіш на досвітку
і будзіш з паўсоння.
Ахоўніца мараў,
заранка здзяйсненняў,
ты — ад сонца.

Глядзіш на мой смутак,
неспакой,
маўклівасць,
боль развітанняў,
спадзяванняў чуллівасць...

Надзея, сястрыца,
прашу цябе шчыра,
будзь правадніком
сярод бездарожжа,
бур'яну,
травы пыхлівай.

kamunikat.org

* * *

Актам смеласці
ёсць ціша
і голас сэрца ў цішы.

Актам смеласці
ёсць слова –
белае, як праўда.

Актам смеласці
ёсць крок,
што ставіш супраць ветру.

Кім быць?
Як жыць?
Як...?

Пытанні, смеласць...
Ява,
мары,
сон.

У смеласці – надзея.
А ў надзеі –
адкрыты гарызонт.

* * *

Папоцемку ідзём.
Ступаем ціха
і асцярожна.

Па дарозе
вобразы за вобразамі
прыбліжаюцца,
словы за словамі
ажываюць,
думкі за думкамі
ярчэюць.

У вачах прага.
У сэрцах схаваныя
коп'і мараў.

Світае.
Пара на доўгачаканае,
любімае, каханае!

* * *

З усіх вершаў,
быццам з вакон,
выглядаю сонца.
На родных гонях
са сну зімовага
буджу прадвесне.
Калі іду,
мне марыцца
спатканне з маем –
жывым і ў квецені.

З усіх вершаў,
быццам з вакон,
выглядаю сонца.

.

KAMUNIKAT.org

## САКАВІК

Зелянее вярба.
Пад нагамі раса.
Над лугамі імгла.
Над дарогай зара.

Вішнёвы сад зацвіце.
Салавей запяе.
Свет станецца светлы.

Заўтра будзе мой баль,
Заўтра будзе наш баль...

Сонца, зараз зайграй!
Сонца, зараз зайграй...

## ТОЛЬКІ ВЯСНА

Рэвалюцыйныя лозунгі на мурах,
парывы паўстанцаў,
бунты,
два фронты,
жывыя факелы,
выстралы гармат і —
коркаў шампанскага...

Мала.

Толькі вясна
поўнасцю варушыць
кровазварот свету.

KAMUNIKAT.org

## ЯБЛЫНЯ

Штовечар ля майго акна
вырастае маладая яблыня.
У дом уваходзіць у квецці,
у паводцы веснавога лісця.
На галінках дрэва
зоры срэбрацца
або прывабліва мільгаюць
з касмічных даляў –
засынаю.

Нехта раніцай
збірае сны,
раскінутыя мары.
У маёй памяці
застаецца цень
маладой яблыні.

KAMUNIKAT.org

## ВОСЕННЮ

Вербы, ясені і клёны
нада мной шумелі восенню.
Шумелі, кронамі гайдалі,
пад ногі лісце клалі.

Ішоў сцежкай,
а ў далях выцвіталі мары.

KAMUNIKAT.org

## ВОСЕНЬ

Апусцелая сцежка.
Ліст.
Маўчанне.

На схіле гары
шамаціць каменне.

Я і ты,
мая безабароннасць –
восень.

* * *

Па стромым схіле гары
ўсё вышэй ды вышэй
падымаюся.

Пусцее сцежка.
Імгла гусцее...
Насуперак холаду,
сэрца не сціхае.

Іду туды,
дзе Ты чакаеш...

KAMUNIKAT.org

* * *

Я – камень.
Я – трыванне.
Крык унутры,
маўчанне.

Сяджу за сталом,
думаю:
Горы – далёкія!
Рэкі – шырокія!
Муры – высокія!
Я – камень.

Ноч. Не сплю.
У акно гляджу –
вось выплыў шар...

Чырванню
раптам заззялі ружы
ў цёмным пакоі мараў.

* * *

Два светы і толькі адно сонца.
Шчаслівасць травы.
А сэрца – ў самоце.

Вочы, пустыня, пясок...
Сны – на парозе – нявысненыя.

Гарыць, дагарае галлё.
Боль ува мне
расце, як дрэва.

У найвялікшай гатоўнасці
сам-насам іду –
на сустрэчу з сабою.

Пакута мая – вастрыё думак.
Мова мая – цень крыку.

* * *

Калі заплюшчваю вочы,
явіцца мне верш
белым па чорным
пісаны.

Словы ў ім такой моцы,
як крылы.
І, як крылы,
зламаныя.

Словы – звон.
Словы – крык.
Словы – енк.
Словы – шэпт.
Словы... ціш...

Боль.
Ён у трэшчынах сэрца.

KAMUNIKAT.org

## СВЕТ

Я маляваў свет
колерам сваіх думак.
Са слоў
высякаў агонь.
Палымяныя пісьмы слаў
сябрам і незнаёмым.
Цемру палохаў святлом,
холад – цяплом.
Змагаўся са злом
і няпраўдай.
У акне,
адкрытым на шчасце,
выгледжваў будучыню.
З ног да галавы
апранаўся
ў надзеі лісце.
Ішоў ды бег
доўгачаканаму
насустрач.

Рассыпаліся дні.
Прамінулі сны.

Раптам у дзверы
хтосьці пастукаў:
— Гэта я,
твая самотнасць!

## ЛІТАННЕ

Маці жывых і мёртвых,
Маці прысутных і прапаўшых,
Маці галодных і сытых,
Маці бедных і багатых,
Маці маўклівых і непакорных,
Маці вольных і нявольных,
Маці чужых і родных,
Маці герояў і здраднікаў,
Маці святых і грэшных,
Маці любові нашай –

ратуй ад бяспамяцтва.
І забыцця.

KAMUNIKAT.org

* * *

Маім апошнім домам будзе
ноч.
Маім апошнім сябрам будзе
вецер.
Маёй апошняй песняй будзе
крык.
Маім апошнім словам будзе
першае слова.

KAMUNIKAT.org

* * *

Дні трывання
бясследна прамінаюць.
Гады чакання
Бязгучна адплываюць.

Нявідная даль.
Неба поўнае
цёмных хмар.

У глыбіні душы
струменіцца ручай...
Гэта жаль
няздзейсненых мар...

* * *

Адыходзяць на пенсію
патрыёты майго краю.
Не забыць іх думак,
аксаміту голасу...

Кветкі адпалаюць.
Крыніцы высахнуць.
Сцяжынкі зарастуць...

Маўчыць зямля.
І неба маўчыць.

Пасярэдзіне свету
стаю ў белі
першага слова.

## СТАРЫ ПАЭТ

Стары паэт
не паспеў у жыцці
усяго спазнаць,
пражыць,
пра найважнейшае сказаць
сваёй прысутнасцю.

Сёння
кленчаць яго вершы —
незаконныя думкі,
нерухомыя вобразы,
пакінутыя ідэі.

Восеньскі дождж
паміж маршчынамі слоў
выпалосквае
ясныя дні,
каляровыя шкельцы
шчасця.

## ХТОСЬЦІ

Хтосьці ва ўсе брамы ламаецца,
здабывае прастору.
Хтосьці дабіраецца
да майго свету.
Як вуж, кожнай шчылінай уваходзіць,
як леапард падкрадаецца —
сцяблінка не трэсне,
галінка не раскалышацца.
Моўчкі паўзе,
усё займае..

Цішыня...
Ціша...

KAMUNIKAT.org

## ПЕРАМОЖЦЫ

Сцеражыся трыумфу –
у ім пастка лёсу.

Зважай на гордасць –
у ёй знакі краху.

Моц твая –
твой унутраны вораг.

Белая косць
страху.

KAMUNIKAT.org

* * *

Жыву. Жыву і пішу.
Дні кладуцца,
як пакосы травы
на сенажаці.
Ные душа.
А ў сэрцы ўсё яшчэ –
вясна.
Шмат цяпла
і сонечнага бляску.
У намаганнях гарачых,
мітусні за хлебам
спазіраю на неба.
Вецер раз-пораз
падымае пыл –
ён ад руін.

Іду
дарогай памяці
насустрач замеці.

KAMUNIKAT.org

* * *

У краіне маўклівых каменняў
вучуся гаварыць “я”.
Быццам замову,
шапчу словы вернасці.
Пішу,
каб з траў і забыцця
узняць вочы.
Мой унутраны голас –
гэта крык белых сцен
на лініі жыцця
і нябыту.

## КАЛЯ КРЫНІЦЫ

Калі толькі схіляюся,
каб з крыніцы
зачарпнуць вады-вадзіцы,
чую, як хтосьці
па нагах сцёбае,
па спіне хвошча.

Хто ён?
Сябар, беларус тутэйшы.

За што пакаранне?
За ваду ці за вершы?

KAMUNIKAT.org

## МАЯК

Сучасныя варвары
косці ламалі,
ранілі твары.

У акружаных,
падняволеных подла
адбіралі годнасць.

Нянавісці вецер
раздзіраў грудзі,
каб у сэрцах застываў
страх.

Пусцелі дамы.
Цвілі камяні.
Спыняўся пульс ракі.

Паўсюдна кружылася
чырвонае лісце.
Сляды памяці
закідала замець...

Аднак,
на ўскраіне свету,
на скалістым мысе
збудавалі маяк
маладыя паэты.

Сёння
надзеі полымя
ўзнімаецца,
мігціць –

над свяцілішчам гэтым.

KAMUNIKAT.org

* * *

Хаджу ад акна да акна,
ад дзвярэй да дзвярэй,
ад расы да імглы,
ад вярбы да ракі,
ад бору да ўзвышша.

Мой краявід – круг вернасці.
Ён на яве ды ў песнях.
Ён у думках ды ў вершах.

І няма патрэбы ісці
за далягляд сэрца.

KAMUNIKAT.org

## ЗЯРНЯТКА ЗЯМЛІ

Хвалі жыцця
накочваюцца і адплываюць,
сціраючы сляды
чалавечай прысутнасці.

Я – зярнятка зямлі,
якое заблудзіла
паміж двума
радкамі верша.

KAMUNIKAT.org

* * *

Шукайце мяне ў выраі.
У снах нявысненых.
Пасярод свежай раллі.
На сінім беразе ракі.
У настальгічных шэсцях
траў і лісця.
У першым крыку верша.
У цішы
і ў песнях –

Там б’ецца
маё сэрца.

* * *

Паэты выходзяць з цемры.
У кожнага ў руках –
галінка святла.
Святло гэтае, як хлеб,
як вада
і як паветра.

З добрым словам
іду сябрам насустрач,
каб спаткацца
на гонях жыцця
і несмяротнасці.

KAMUNIKAT.org

* * *

Часам
шукаем вёслы.
Іншым разам
нам прыдаліся б крылы.

Аднак заўсёды
патрабуем веры,
надзеі,
любові.

* * *

Малюся марам,
малюся хмарам,
малюся небу.

У нявысненых снах
шукаю
праменьчыкаў сонца.

Пяром несмяротным,
жарынкай надзеі
пішу верш...

KAMUNIKAT.org

* * *

Пасярод пеністых плыняў
зрокам неабдымнай
ракі забыцця –
адзінокая,
вечназялёная грань.

Востраў выратавання –
Слова.

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

# Змест

* * * На гэтай зямлі **5**
Сэрца **6**
* * * Пад тваю абарону іду **7**
На гэтай зямлі **8**
Ідзём па шчасце **9**
* * * Мама мілая **10**
* * * Мілая мая, дзеткі мае **11**
* * * Неба і зямля **12**
Родным **13**
У цішы свету **14**
* * * Паміж апушчанымі **15**
* * * Неспакойным дням **16**
Надзея **17**
* * * Актам смеласці **18**
* * * Папоцемку ідзём **19**
* * * З усіх вершаў **20**
Сакавік **21**
Толькі вясна **22**
Яблыня **23**
Восенню **24**
Восень **25**
* * * Па стромым схіле гары **26**
* * * Я — камень **27**
* * * Два светы і толькі адно сонца **28**
* * * Калі заплюшчваю вочы **29**
Свет **30**
Літанне **31**
* * * Маім апошнім домам будзе **32**

* * * Дні трывання **33**
* * * Адыходзяць на пенсію **34**
Стары паэт **35**
Хтосьці **36**
Пераможцы **37**
* * * Жыву. Жыву і пішу **38**
* * * У краіне маўклівых каменняў **39**
Каля крыніцы **40**
* * * Маяк **41**
* * * Хаджу ад акна да акна **43**
Зярнятка зямлі **44**
* * * Шукайце мяне ў выраю **45**
* * * Паэты выходзяць з цемры **46**
* * * Часам **47**
* * * Малюся марам **48**
* * * Пасярод пеністых плыняў **49**